6. Лавлинский, С. П. Визуальное в литературе / С. П. Лавлинский, Н. М. Гурович: Поэтика: словарь актуальных терминов и понятий. – Москва : Издательство Кулагиной, 2008. – С. 37–39.
7. Лепахин, В. В. Икона и иконичность. / В. В. Лепахин. – Сегед: JATE Press, 2000. – 264 с.
8. Конан, У. Матывы раю і пекла ў паэзіі і драматургіі Янкі Купалы / У. Конан // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, ГрДУ імя Я. Купалы, Ін-т гіст НАНБ; рэдкал. С. В. Марозава. – Гродна : ГрДУ, 2008. – С. 79–80.
9. Лецка, К. І. Вытокі і генезіс беларускага рамантызму XIX стагоддзя / К. І. Лецка. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2003. – 370 с.
10. Хаўстовіч, М. В. Ян Баршчэўскі / М. В. Хаустовіч, У. І. Мархель // Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. ; рэдкал.: У. Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск, 2007. – Т. 2 : Новая літаратура, другая палова XVIII–XIX стагоддзе. – С. 151–177.
11. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі ; уклад., прадм. і камент. М. Хаустовіча. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.

# АСАБЛІВАСЦІ ЛЕКСІКАГРАФІЧНАГА ПРАДСТАЎЛЕННЯ АРНІТОНІМАЎ У “ТЛУМАЧАЛЬНЫМ СЛОЎНІКУ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ”

***В. Э. Літаш (Мінск, Беларусь)***

Тыповы слоўнікавы артыкул у “Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы” (далей – ТСБЛМ) [1] складаецца з шэрага элементаў. Асноўнымі з іх з’яўляюцца:

1. **Рэестравае слова**. Рэестравае слова выдзелена тлустым шрыфтам, напісана вялікімі літарамі, каб было лягчэй размяжоўваць артыкулы і шукаць неабходныя словы. У некаторых артыкулах прыводзяцца розныя варыянты напісання, яны перадаюцца праз злучнік і: **ЖА́ВАРАНАК і ЖА́ЎРАНАК, БУСЛЯНЯ́ і БУСЛЯНЁ, БЕРКУЦЯНЯ́ і БЕРКУЦЯНЁ**.

2. **Граматычныя паметы.** Граматычная характарыстыка слоў ажыццяўляецца праз маркіраванне роду, ліку, склонавыя канчаткі (у родным і месным склонах, часам – у давальным і месным склонах). Напрыклад: **БУГА́Й**, -я́, мн. -і́, -ёў, м.; **ВАЛАСЯ́НКА**, -і, ДМ -нцы, мн. -і, -нак, ж.

У некаторых слоўнікавых артыкулах пазначана спецыфіка ўжывання слоў з лічэбнікамі: ДРАФА́, ы́, мн. дро́фы і (з ліч. 2, 2, 4) драфы́, дроф, ж.

У ТСБЛМ словы ў формах розных склонаў і лікаў падаюцца неаднолькава: калі не можа ўзнікнуць пытанняў па напісанні і пастаноўцы націскаў, прыводзіцца толькі канчатак; указваецца цэлае слова, калі змяняецца месца націскаў: **І́БІС**, -а, мн. -ы, -аў, м.; **ДРОЗД**, дразда́, мн. дразды́, драздо́ў, м.; **БАКА́С**, -а́, мн. -ы́, -о́ў, м.; **ІВАЛГА**, -і, ДМ -лзе, мн. -і, -аў.

3. **Дэфініцыя.** Сэнсавыя характарыстыкі ў многіх слоўнікавых артыкулах ТСБЛМ вызначаюцца сістэмнасцю. Амаль што ва ўсіх слоўнікавых артыкулах пазначаецца, да якога сямейства і атрада адносіцца птушка. Дзякуючы выкарыстанню складаных сказаў раскрываецца месца жыхарства птушкі, знешні выгляд, асаблівасці харчавання і пад.: **КНІ́ГАЎКА**, -і, ДМ -гаўцы, мн. -і, -гавак, ж. Птушка сямейства сяўцоў, якая жыве на балотах, сырых лугах; **ДРАФА́**, -ы́, мн. дро́фы і (з ліч. 2, 2, 4) драфы́, дроф, ж. Буйная стэпавая птушка атрада жураўлепадобных з доўгай шыяй і моцнымі нагамі.

ТСБЛМ змяшчае слоўнікавыя артыкулы, у якіх апісваюцца полісеманты. У гэтым выпадку на першым месцы прыводзіцца больш ужывальнае значэнне. Таму пры дыстрыбуцыі значэнняў у слоўнікавым артыкуле ў некаторых выпадках першым падаецца не ўласна дэфініцыя, а адсылка да іншага слоўнікавага артыкула:

**БУГА́Й**, -я́, мн. -і́, -ёў, м. 1. Тое, што і бык (у 1 знач.). 2. Начная балотная птушка сямейства чапляў, якая, апусціўшы дзюбу ў ваду, утварае гукі, падобныя да рову быка; **БУ́СЕЛ**, -сла, мн. буслы́, -о́ў, м. 1. Вялікая пералётная птушка з доўгай прамой чырвонай дзюбай і доўгімі чырвонымі нагамі. 2. Высокая бутэлька гарэлкі (уст., разм.). У слоўнікавым артыкуле **БУ́СЕЛ** ужываецца стылістычная памета. Яна указвае, што слова з'яўляецца ўстарэлым, ужо выйшла з шырокага ўжытку, але яшчэ даволі добра вядома ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Разам з тым, у ТСБЛМ адзначаецца і некаторая непаслядоўнасць пры семантызацыі арнітонімаў. Так, у адных выпадках указваецца сямейства (атрад) птушкі, месца жыхарства, асаблівасці паводзін, у другіх – знешні выгляд і якасці, у трэціх – знешні выгляд і асаблівасці харчавання і г. д. (табліца).

Табліца – Асаблівасці семантызацыі некаторых арнітонімаў у ТСБЛМ

| **Назва птушкі** | **Сямейства, атрад** | **Месца жыхарства** | **Знешні выгляд і якасці** | **Час актыўнасці / асаблівасці паводзін** | **Пералётная / неперадётная** | **Дзікая / свойская** | **Асаблівасці харчавання** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бугай | сямейства чапляў | балотная птушка | | начная / апусціўшы дзюбу ў ваду, утварае гукі, падобныя да рову быка | | | |
| Бусел | | | вялікая птушка з доўгай прамой чырвонай дзюбай і доўгімі чырвонымі нагамі | | пералётная | | |
| Варона | птушка сямейства крумкачовых | | з чорна-шэрым або чорным апярэннем | | | | |
| Голуб | птушка сямейства галубіных | | пераважна з шаравата-блакітным ці белым апярэннем і вялікім зобам | | | | |
| Гусь | | | вадаплаўная птушка з доўгай шыяй | | | дзікая і свойская | |
| Драфа | атрада жураўлепадобных | стэпавая птушка | буйная, з доўгай шыяй і моцнымі нагамі | | | | |
| Зязюля | | лясная птушка | | не ўе гнязда і кладзе яйкі ў чужыя гнёзды | пералётная | | |
| Кнігаўка | птушка сямейства сяўцоў | жыве на балотах, сырых лугах | | | | | |
| Крумкач | сямейства крумкачовых | | вялікая чорная птушка | | | | жывіцца пераважна падлай |

4. **Ілюстрацыі**. Асаблівасцю ТСБЛМ з'яўляецца падача ілюстрацыйнага матэрыялу ў выглядзе слоў, словазлучэнняў, невялікіх сказаў без спасылкі на аўтарства. Паміж сабой прыклады размяжоўваюцца спецыяльным знакам ||. Слоўнікавыя артыкулы сумяшчаюць ілюстрацыі ўжывання слова ў прамым і ў пераносным значэннях. Падаюцца (пры наяўнасці) і памяншальна-ласкальныя словы: ГО́ЛУБ, -а, мн. галубы́, галубо́ў, м. Птушка сямейства галубіных пераважна з шаравата-блакітным ці белым апярэннем і вялікім зобам. Дзікі г. Г. міру (відарыс белага голуба як сімвал міру). || памянш. галубо́к, -бка́, мн. -бкі́, -бко́ў, м. || прым. галубі́ны, -ая, -ае. Галубіныя гнёзды. Галубіная пошта. Галубіная душа (перан.); ГУСЬ, -і, мн. гу́сі, -е́й, ж. Дзікая і свойская вадаплаўная птушка з доўгай шыяй. Як з гусі вада (таксама перан.: нічога не дзейнічае). || памянш.-ласк. гу́ска, -і, ДМ -сцы, мн. -і, -сак, ж. || прым. гусі́ны, -ая., ае; ЗЯЗЮ́ЛЯ, -і, мн. -і, зю́ль, ж. Лясная пералётная птушка, якая звычайна не ўе гнязда і кладзе яйкі ў чужыя гнёзды. || прым. зязю́лін, -а, -ы. З. лён (назва расліны сямейства гваздзіковых; куколь).

Акрамя таго, ТСБЛМ змяшчае слоўнікавыя артыкулы, у якіх ілюстрацыйны матэрыял адсутнічае: ДЗЯРКА́Ч, дзеркача́, мн. дзеркачы́, дзеркачоў, м. Невялікая лугавая птушка сямейства пастушковых з характэрным скрыпучым крыкам; драч.

Асобныя назвы птушак выкарыстоўваюцца ў складзе фразеалагічных адзінак. Для лексікаграфічнай перадачы такіх выпадкаў прымяняецца спецыяльны сімвал ◊: ВАРО́НА, -ы, мн. -ы, -ро́н, ж. 1. Птушка сямейства крумкачовых з чорна-шэрым або чорным апярэннем. 2. перан. Пра нерастаропнага, нехлямяжага чалавека (разм.). ◊ **Белая варона** – пра чалавека, які рэзка выдзяляецца чым-н. сярод іншых. **Варон лічыць** – быць разявакай. || зб. **вараннё**, -я́, н. (да 1 знач). Наляцела в.; ЛА́СТАЎКА, -і, ДМ - таўцы, мн. -і, -тавак, ж. 1. Пералётная птушка атрада вераб'іных з вузкімі вострымі крыламі, вёрткая і хуткая у палёце. Берагавая л. Белагрудая л. 2. Гімнастычная фігура, пры якой пастава цела нагадвае птушку у палёце. 3. Ласкавы зварот да асоб жаночага полу. ◊ **Першая ластаўка** – пра першыя прыкметы з'яўлення чаго-н. || прым. ла́стаўчын, -а (да 1 знач.). Ластаўчына гняздо; КУ́РЫЦА, -ы, мн. ку́ры і (з ліч. 2, 3, 4) ку́рыцы, -рэй, ж. 1. Свойская птушка, якую разводзяць для атрымання яек і мяса. 2. Самка птушак атрада курыных. К. з куранятамі. 3. Мяса курыцы; кураціна. ◊ **Класціся спаць з куранямі** – вельмі рана. **Курам на смех** – пра што-н. вельмі недарэчнае. **Куры засмяюць** каго – пра таго, хто робіць што-н. недарэчнае. **Куры не клююць** – вельмі многа (звычайна пра грошы). **Мокрая курыца** – пра растрывожанага, спалоханага або бязвольнага, бесхарактарнага чалавека. || памянш. **ку́рачка**, -і, ДМ - чцы, мн. -і, -чак, ж. || прым. **куры́ны**, -ая, -ае.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што слоўнікавыя артыкулы ў ТСБЛМ, прысвечаныя апісанню арнітонімаў, у цэлым характарызуюцца наяўнасцю аднолькавых зон інфармацыі і ідэнтычнай структурай, аднак нярэдка адрозніваюцца паводле зместавага напаўнення. Гэта сведчыць пра важнасць далейшай распрацоўкі прынцыпаў сістэмнай лексікаграфіі, што будзе садзейнічаць максімальнай уніфікацыі лексікаграфічнага апісання суадносных груп лексічных адзінак у прыватнасці і слоўнікавага складу мовы ўвогуле.

## Бібліяграфічны спіс


1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / уклад. : І. Л. Капылоў [і інш.] ; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2016. – 968 с.